Слова «Рэйкі» азначае Універсальная Жыццёвая Энергія.

Сістэма ўрача М.Усуі з'яўляецца не толькі самай простай і натуральнай, але і самай эфектыўнай методыкай перадачы Універсальнай Жыццёвай Энергіі.

У сістэме натуральнага аздараўлення Рэйкі гаючая энергія перадаецца спантанна і без канцэнтравання якіх-небудзь намаганняў шляхам прыкладання рук праваадніка гэтай энергіі на ўласнае цела або цела іншага чалавека. Пры гэтым сіла перадаваемай энергіі арыентавана на патрэбнасць атрымальніка энергіі. Рэйкі праходзіць праз розныя матэрыялы: бінты, адзенне, гіпсавую павязку і інш. Так як перадатчыкі Рэйкі з'яўляецца толькі каналам, праводзячым гэту Універсальную Жыццёвую Энергію, ён не траціць асабістыя сілы, наадварот, сам умацоўваецца і абагачаецца энергіяй.

Рэйкі-каналам, або Рэйкі-праваднікам, можа стаць кожны. Для гэтага не абавязкова мець асаблівыя здольнасці, трэба толькі жаданне.

Рэйкі як сістэма натуральнага аздараўлення не з'яўляецца якой-небудзь формай спірытызму, кліку духаў або дэманаў. Рэйкі не мае нічога агульнага з акультызмам, гіпнозам або псіхатэхнікай. Рэйкі не патрабуе асобай веры ў якую-небудзь рэлігію, гэта шлях да ўнутранага росту, да гарманізацыі.

Да гэтага варта дадаць, што сістэма Рэйкі не ўступае ў супярэчнасць з традыцыйнай медыцынай, наадварот, яна падтрымлівае і абагачае такія метады лячэння, як лячэбны масаж, акупунктуру і акупрэсуру, медыкаментозную тэрапію, псіхатэрапію. Сістэма Рэйкі з'яўляецца цэласным метадам аздараўлення і пры гэтым комплексна дзейнічае на ўсіх узроўнях: целесным, духоўным, эмацыянальным і душэўным. Яна выраўноўвае і ўраўнаважвае энергетычны баланс, аднаўляе душэўную гармонію і паляпшае духоўнае самаадчуванне. Пры дапамозе Рэйкі арганізм ачышчаецца ад ядаў. Рэйкі надзвычай прыемны цэласны метад аздараўлення, які ў першую чаргу арыентаваны на патрэбнасць пацыента ў гэтай складанай здаровай энергіі. Пры гэтым трэба дадаць, што Рэйкі ніколі не можа пашкодзіць.

Вынікі прымянення сістэмы Рэйкі, атрыманыя ў Беларускім цэнтры TERRA HUMANICA REIKI, вельмі станоўчыя. У большасці выпадкаў пацыенты гаварылі аб значным паляпшэнні ў стане здароўя, а таксама паляпшэнні ў душэўным стане.

Станоўчыя вынікі атрыманы пры рабоце з дзецьмі-інвалідамі. Першапачаткова пацыентам прапанаваўся курс з 4 заняткаў. Канчатковую колькасць заняткаў устанаўліваў сам пацыент. Тут дарэчы адзначыць, што хранічныя захворванні патрабуюць большай колькасці заняткаў.

У нашы дні адбыліся істотныя змены ў развіцці навуковай думкі, у тым ліку і ў медыцыне. Буйна развіваецца ў апошнія дзесяцігоддзі хіміятэрапія. Аднак прымяненне сінтэтычных лячэбных сродкаў не змагло радыкальна вырашыць некаторыя праблемы медыцыны, такія як прычыннасць большасці ўнутраных захворванняў, нервова-псіхічнай і эндакрыннай паталогіі, злаякасных пухлін і разнастайных алергозаў. Акрамя гэтага, у сучасных умовах ўзнікаюць вялікія складанасці ў набыцці элементарных лячэбных сродкаў. І пагэтаму для набыцця цэласнага погляду на прыроду захворвання і шляхі выздараўлення чалавека неабходна прымяняць веды, назапашаныя многімі пакаленнямі старажытных лекараў.

Сістэма Рэйкі можа прымяняцца не толькі як аздараўленчая методыка, накіраваная на паляпшэнне стану здароўя чалавека, але і як сістэма, актывізуючая творчы патэнцыял асобы. Вопыт прымянення Рэйкі пацвярджае гэта.

Пацыентка Л., 37 гадоў, ніколі не меўшая справы з мастацкай творчасцю, пасля заняткаў выявіла цікавасць і здольнасці да фларыстыкі і мастацкага інкруставання саломкай. Гэта было для яе сапраўдным адкрыццём. Ёсць і многія іншыя сведчанні. Гэта гаворыць аб тым, што сістэма Рэйкі можа быць паспяхова выкарыстана ў педагагічнай практыцы для актывізацыі творчага развіцця навучэнцаў.

Выкарыстоўваючы веды па сістэме натуральнага аздараўлення Рэйкі, сучасны чалавек можа прымаць удзел у стваральнай эвалюцыі самого сябе і пры гэтым удасканальваць у касмічным тварэнні, пазнаючы законы касмічных сіл. Менавіта дзейнічаючы ў згодзе з гэтымі законамі, чалавек становіцца тварцом.

Рогач Т.М.,
выкладчык

## ПСІХАФІЗІЧНЫЯ МАГЧЫМАСЦІ СІСТЭМЫ РЭЙКІ Ў АКТЫВІЗАЦЫІ ПРАЦЭСУ НАВУЧАННЯ

Важнейшай педагагічнай праблемай сёння з'яўляецца праблема актывізацыі навучальнай дзейнасці. Г.А.Кітайгародская разумее актывізацыю навучальнай дзейнасці як працэс, які накіраваны на дасягненне стану актыўнасці суб'екта, на выяўленне і ўтрыманне гэтай здольнасці чалавека. Працэс навучання з'яўляецца адным з відаў пазнавальнай дзейнасці і патрабуе пастаяннай інтэлектуальнай актыўнасці навучаемага.

Актывізацыя навучальнай дзейнасці абумоўлена ўменнем ёю кіраваць. Кіраванне можа быць рэалізавана, у прыватнасці праз спецыяльную арганізацыю вучэбнага матэрыялу, яго канцэнтрацыю і размеркаванне, а таксама праз сістэму адпаведных метадаў і прыёмаў навучання. Гаворка ідзе, напрыклад, аб удасканальванні метадаў адбору, групоўцы і размяшчэнні ў праграме вучэбнага матэрыялу, аб мадэляванні найбольш эфектыўных сістэм практыкаванняў, прыёмаў кантролю і інш. Заданні па актывізацыі навучання ўтрымліваюць высокія патрабаванні да практыкаван-

няў як спосабу рэалізацыі кіравання навучальнай дзейнасцю навучаемых, як раней прадугледжанаму ўздзеянню на мысліцельныя аперацыі навучаемых. У аснове практыкаванняў знаходзіцца энергетычная частка жыццядзейнасці індывідыума, бо толькі яе наяўнасць выклікае разумовую актыўнасць навучэнцаў.

Немалаважную ролю ў актывізацыі навучання мае разнастайнасць форм выканання заданняў, апісанне якіх у цэлым радзе метадычных прац дае вялікія магчымасці для творчай фантазіі выкладчыкаў.

Актывізацыя вучэбнага працэсу можа быць забяспечана і за кошт інтэнсіўнага навучання. Пры гэтым магчыма парная і групавая работа – спаборніцтва ў падборы фактаў па пэўным пытанні, узаемададаўняльны аналіз інфармацыі, прывядзенне процілеглых палажэнняў і інш.

Пад актывізацыяй навучальнага працэсу, такім чынам, разумеецца сукупнасць спосабаў арганізацыі і кіравання вучэбна-пазнавальнай дзейнасцю, накіраваных у першую чаргу на актывізацыю мыслення, творчасці навучаемых пры пастаянным узаемадзеянні выкладчыка з навучэнцамі пры дапамозе прамых і адваротных сувязей.

Лічым неабходным назваць яшчэ адзін спосаб актывізацыі вучэбна-пазнавальнага працэсу, які грунтуецца на выкарыстанні спецыфічнага стану навучэнцаў або прымяненні сістэмы псіхолага-арыентаваных сродкаў, такіх як рэлаксапедыя, рытмапедыя, методыка апоры на рэзервовыя магчымасці асобы навучаемага і калектыву навучэнцаў. Прымяненне нетрадыцыйных метадаў і сістэм, у дадзеным выпадку гутарка ідзе пра сістэму Рэйкі, дазваляе значным чынам уплываць на працэс навучання, дапамагае навучаемым адчуваць сябе больш свабодна, натуральна, пазнаць сябе і праявіць пры гэтым свае лепшыя якасці, моцныя і добрыя бакі.

Рэйкі – гэта цэласны метад, які аказвае гарманізуючы і стабілізуючы ўплыў на фізічны, духоўны, маральна-псіхічны стан чалавека. Рэйкі ўплывае на кожнага чалавека вельмі індывідуальна, вынікі ўздзеяння вызначаюцца патрэбнасцямі кожнага. Ёсць агульныя асаблівасці, якія даюць станоўчыя вынікі ў большасці выпадкаў тэрапіі цела і розуму. Вось далёка не поўны спіс эфектаў уздзеяння Рэйкі: гэта збалансаванне энергіі, яе ўзмацненне, дапамога ва ўстараненні эмоцый, зняцці стрэсу, таксама павышэнне творчасці, свядомай успрымальнасці, гэта і ўздзеянне на прычынны ўзровень узнікнення страху і баязлівасці, а таксама агульнае аздараўленне (гарманізацыя).

Практычны аспект прымянення сістэмы Рэйкі назіраўся і вывучаўся непасрэдна ў працэсе навучання, у прыватнасці нямецкай мове. Прымяненне выкладчыкам гэтага метаду садзейнічае зняццю напружанасці і стомленасці, у групе навучання пануе атмасфера ўспрымання, прызнання і прыняцця навучаемага такім, якім ён ёсць, што садзейнічае канцэнтрацыі увагі, павышэнню інтарэсу, больш актыўнаму засваенню матэрыялу, а таксама актывізацыі разумовай дзейнасці.

Дзякуючы павышэнню свядомага ўспрымання матэрыялу і павышэнню творчай актыўнасці як навучаемага, так і таго, хто навучае, перабудоўваецца вучэбная камунікацыя -- шляхі і формы ўзаемадзеяння выкладчыка і навучэнцаў. Рэйкі – гэта шлях да ўнутранага росту, гэта крыніца энергіі, даступная кожнаму, практычнае прымяненне якой у вучэбным працэсе дасць магчымасць навучэнцам больш творча і спакойна выкарыстоўваць свае здольнасці для засваення ведаў.

Чалабітчанка І.А.,
выкладчык

## АЗДАРАЎЛЯЛЬНАЯ СІСТЭМА РЭЙКІ Ў ПРАКТЫЦЫ РАБОТЫ З ДЗЕЦЬМІ-ІНВАЛІДАМІ

Дваццатае стагоддзе ўнесла карэнныя змены ў спосаб жыцця і мыслення чалавека. Людзей заўсёды хвалявалі пытанні выхавання і самавыхавання, заўсёды цікавілі таямніцы жыцця, звязаныя са здароўем, хваробай і магчымасцю бязмежнага ўдасканалення псіхікі і цела. Галоўная асаблівасць гэтых пытанняў у тым, што спробы знайсці для іх хоць якое-небудзь тлумачэнне прыводзяць да вынікаў, якія з вялікімі цяжкасцямі ўкладваюцца ў рамкі сучасных ведаў.

Мэта нашай працы -- гэта аналіз практычнай дзейнасці аздараўлення дзяцей-інвалідаў па сістэме Рэйкі.

Аб'ектам даследавання была група з 25 чалавек ва ўзросце ад 3 да 18 гадоў дзяцей-інвалідаў Заводскага раёна горада Мінска з наступнымі захворваннямі: дзіцячы цэрэбральны параліч (ДЦП), хранічны гастрыт, хранічны бранхіт, блізарукасць, анемія, дыскінезія жоўцевых каналаў, дыспепсія, алергія, алігафрэнія, эпілепсія, прыроджаны парок сэрца (ППС), дэрматыт, мікрацэфалія, неўрастэнія.

Прадметам даследавання былі пытанні практычнага прымянення сістэмы натуральнага аздараўлення Рэйкі ў рэабілітацыйным працэсе дзяцей-інвалідаў.

У працы выкарыстоўваліся метады выключнага назірання і апытання, анкетавання.

Асноўнай задачай было вывучэнне і выяўленне магчымасцей эфектыўнасці прымянення сістэмы натуральнага аздараўлення Рэйкі.

Вельмі часта ў хворых з парушэннямі інтэлекту і эмоцый не выяўляецца істотных адхіленняў ад нормы. У сваёй працы мы выкарыстоўваем дыягностыку, заснаваную на аналізе паводзін.

Пры апытванні высвятляюцца сем галоўных аспектаў разумовай і эмацыянальнай дзейнасці:

1) разуменне,

2) афект і эмацыянальны тон,